ДУК «Бібліятэчная сетка Хоцімскага раёна»
Аддзел па абслугоўванню дзіцячага чытача

# Беларускія кнігі-юбіляры 2022 год

**Працягваем знаёміць Вас з кнігамі-юбілярамі 2022 года! Гэта выдатныя кнігі, якія перачытваюцца людзмі розных пакаленняў!**

# 45 год




**Караткевіч У. «Зямля пад белымі крыламі»**

Нарыс Уладзімера Караткевіча прысьвечаны Беларусі. Аўтар запрашае маладога чытача ў падарожжа па Беларусі, спрабуе паказаць хараство роднай прыроды, прывіць любоў да роднае зямлі, зацікавіць гісторыяй беларускага народу.

# 50 год




**Быкаў В. «Сотнікаў. Абеліск»**

Вялікая духоўная моц Сотнікава заключаецца ў тым, што ён, пастаўлены перад выбарам жыцця і смерці, здолеў прыняць смерць і тым самым паказаў веліч чалавечага духу, нязломнасць характару, непахісную веру ў будучыню людзей.

Спрэчка, якая вядзецца ў аповесці «Абеліск» прымушае задумацца над сэнсам гераізму, подзвігу і самаахвярнасці, дапамагае адшукаць маральныя вытокі гераічных учынкаў, мнагастайнасць іх праяўлення не толькі ў ваенныя гады, але і ў мірны час.

# 50 год




**Караткевіч У. «Хрыстос прызямліўся у Гародні»**

Раман выдатнага беларускага пісьменніка XX стагоддзя Уладзіміра Караткевіча ўваскрашае падзеі далѐкага сярэднявечча, расказвае пра змаганне беларускага народа супроць антычалавечых феадальных парадкаў і царкоўнага дагматызму. Займальны сюжэт, вобразная, перасыпаная народным гумарам мова твора — якасці, якія, без сумніву, прывабяць чытача.

# 55 год




**Дубоўка У. «Жоўтая акацыя»**

Аповесць распавядае пра цікавую працу школьнага юнатаўскага гуртка «Жоўтая акацыя», пра іх навуковую захопленасць і ў пэўнай ступені фантастычныя планы. У дзейнасці дзяцей назіраецца нават некаторая доля авантурнасці, што вельмі трывожыць бацькоў. Але калі яны бачаць карысць ад доследаў, то і самі падтрымліваюць сваіх нашчадкаў.

# 75 год




**Колас Я. «Рыбакова хата»**

Паэма з 24 раздзелаў, напісаная Якубам Коласам у 1940-1947 гг., выйшла ў серыі "Выбраныя творы беларускай савецкай літаратуры (1917-1947)". За гэты твор у 1949 г. аўтар быў узнагароджаны Дзяржаўнай прэміяй СССР. Паказана жыццё беларусаў пад уладай Польскай дзяржавы. Беларускія сяляне не маюць уласнай зямлі і адчуваюць сваю бяспраўнасць і галечу. Глыбока раскрыты ўнутраны свет селяніна, паказана перажыванні герояў у розных канкрэтных побытавых сітуацыях.

# 95 год




**Маўр Я. «Чалавек ідзе»**

У аснову сюжэта аповесці пакладзены сам працэс развіцця чалавека, мільённагадовы, пакутлівы і драматычны, напоўнены барацьбой за сваё жыццё і з самім сабой, шлях працяглага і маруднага назапашвання не толькі вопыту практычнага, але і духоўнага.

# 95 год




**Купала Я. «Магіла льва»**

У аснове сюжэту паэмы – легенда пра узнікненьне Магілѐва, пра Машэку, нібыта пахаванага на гары з назваю Магіла льва або Машэкава гара.

# 100 год




**Купала Я. «Спадчына»**

Паэт балюча адчуваў трагедыю Бацькаўшчыны, прыгадваў ліхалецце Першай Сусьветнай вайны, выгнанне з родных мясьцін мільёнаў людзей, сваё нядаўняе зняменне перад жорсткасцю і крывавай драмай сусветнай бойні. З гэтых настрояў і роздумаў нарадзіўся верш аб ролі нацыянальнай гісторыі і культуры ў жыцці чалавека.

Кнігі чакаюць Вас

па адрасу:

пл. Леніна, 5

Дзякуй за ўвагу!